


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

*№ 15 (207) 27 кастрычніка 1993 года, серада*


## Сплаў вопыта і маладосці

Вядома, што кафедра як навукова-вытворчае падраздзяленне вышэйшай школы ўяўляе сабой аб´яднанне навуковых работнікаў аднаго профілю. Кафедра педагогікі ва універсітэце атрымала ў спадчыну кадры трох кафедр былога педінстытута (1978 г.) і першапачаткова аб´ядноўвала як педагогаў, так і псіхолагаў (заг. кафедры — праф. С. В. Кандрацьева). З 1982 г. былі створаны 2 самастойныя кафедры: псіхалогіі і педагогікі. Кафедру педагогікі з той пары ўзначальвае В. П. Таранцей (у цяперашні час прафесар). Яе касцяк складалі выкладчыкі з вялікім стажам школьнай і вузаўскай работы, кандыдаты навук, дацэнты Я. І. Будоўскі, І. А. Карпюк, М. А. Мінайлаў, Н. Н. Петрыкава, С. Дз. Янава, М. А. Зянькова, аўтар гэтых радкоў. З развіццём універсітэта кафедра папаўнялася новымі спецыялістамі. У прыватнасці, унутры яе ўзнаўлялася кафедра педагогікі і методыкі пачатковага навучання і адпачкавалася ў якасці самастойнай у 1987 г. На кафедру прыйшлі новыя супрацоўнікі са сваім арыгінальным вопытам, свежымі ідэямі, прывабнымі задумамі. Гэта — В. В. Грынкевіч, В. М. Дарошка, М. У. Міхалковіч, Т. М. Прудко, А. А. Кардабнёў, В. П. Шчарбініна. Гэта — маладыя выкладчыкі, але ўжо сфарміраваўшыяся спецыялісты. Вольга Міхайлаўна — у галіне экалагічнага выхавання, Мікалай Уладзіміравіч — у выхаванні эканамічнага мыслення ў вучняў, Віктар Васільевіч — у маральна-прававым выхаванні падлеткаў. Па гэтых тэмах яны абаранілі дысертацыі. Эксперыментальна-педагагічны атрад «Рубікон», якім вось ужо многія гады кіруе Анатолій Анатольевіч, даўно вядомы ў Рэспубліцы Беларусь, у іншых рэспубліках СНД. Матэрыялы працы склалі асноўную частку яго кандыдацкай дысертацыі. Рухальная актыўнасць дзяцей і яе выкарыстанне ў вучэбным працэсе з малодшымі школьнікамі паслужыла тэмай дысертацыйнага даследавання В. П. Шчарбінінай. Валянціна Пятроўна — арганізатар і навуковы кансультант Цэнтра здаровага развіцця дзіцяці — адной са школ-лабараторый Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы.

Аб прадуктыўнай навукова-даследчай працы кафедры гавораць манаграфіі і дапаможнікі, якія падрыхтаваны яе супрацоўнікамі. За апошнія 2 гады тры выкладчыкі абаранілі кандыдацкія дысертацыі, рэкамендаваны да абароны дысертацыі саіскальніцы В. П. Шчарбінінай і аспіранткі С. А. Пазняк (навуковы кіраўнік — праф. В. П. Таранцей). Працягваюць працу над доктарскімі дысертацыямі В. П. Таранцей, І. І. Пракоп´еў, Н. Н. Петрыкава, В. М. Дарошка, тэмы іх даследаванняў зацверджаны на Вучонай радзе універсітэта.

Вось ужо многія гады пры кафедры ажыццяўляецца даследаванне па дзяржбюджэтнай тэме праблема бесперапыннай падрыхтоўкі настаўнікаў. Матэрыялы даследаванняў абагульнены ў 14-ці кнігах і зборніках, грунтоўных метадычных распрацоўках, апрабаваны на многіх канферэнцыях.

Сплаў вопыта старэйшых і энергіі і запалу маладых служыць добрай падставай для плённай навукова-даследчай працы супрацоўнікаў кафедры.

Між тым у вобласці навуковай і навукова-метадычнай работы ёсць і свае невырашаныя пытанні. Так, было б мэтазгодна і апраўдана за кошт скарачэння вучэбных даручэнняў выкладчыкам, якія маюць вялікі вопыт працы ў ВНУ, даручаць падрыхтоўку вучэбных дапаможнікаў, курсаў лекцый, метадычных рэкамендацый, бо існуючыя дапаможнікі маральна ўстарэлі. Але на кафедры гэта не практыкуецца. Ёсць складанасці ў апублікаванні падрыхтаваных матэрыялаў. Члены кафедры маглі б удзельнічаць у часовых навукова-даследчых калектывах рэспубліканскага ўзроўня, але гэтага пакуль што няма. Ёсць і некаторыя іншыя невырашаныя пытанні. Калектыў кафедры педагогікі выкарыстоўвае пакуль што не ўвесь патэнцыял сваіх творчых магчымасцей па навукова-даследчай працы.

**І. І. ПРАКОП´ЕЎ,**
**нам. заг. кафедры па навуковай працы, дацэнт, кандыдат пед. навук.**



НА ЗДЫМКУ: дацэнты кафедры педагогікі І.І. Пракоп'еў і Я.І. Будоўскі.

*Пункт гледжання*

## На авансцэне гісторыі

**У вуснай і друкаванай публіцыстыцы словы «дэмакратыя» і «таталітарызм» сустракаюцца часта. Прычым слову «дэмакратыя» надаецца амаль што не свяшчэннае гучанне, а слова «таталітарызм» утварылася ў абразлівы ярлык, якім надзяляюцца цэлыя дзяржавы. Некаторыя публіцысты, не разумеючы належным чынам значэння ні першага, ні другога тэрмінаў, імкнуцца ўтварыць іх у антаганізмы.**

**Для аднаўлення праўдзівага значэння гэтых слоў звернемся да тлумачэння даных паняццяў.**

Слова «дэмакратыя» з´явілася ў старажытных грэкаў (каля 5 ст. да н. э.) і сфарміравалася з 2-х слоў — «демас» і «кратас», што азначае «народная ўлада», «улада народа». Але абсалютнай улады народа не было ні ў старажытных грэкаў, ні ў рымлян, бо ў іх значная частка народа — рабы — увогуле была пазбаўлена правоў, не гаворачы ўжо аб удзеле ў «демас кратас». Пры феадалізме аналагічнай бяспраўнай часткай народа з´яўляліся прыгонныя сяляне, якіх феадалы прадавалі і куплялі разам з зямельнымі ўчасткамі. Англійскі парламент, які з´яўляецца зараз рэкламным узорам дэмакратыі, фарміраваўся як дарадчы сход крупных феадалаў пры каралю. У Расіі падобным сходам была Баярская дума пры цару. У Англіі да гэтай пары захавалася феадальная форма ўлады — спадчынная ўлада графаў і лордаў, спадчынная каралеўская ўлада. Абсалютнай дэмакратыі няма і ў ЗША. Тут значная частка насельніцтва — найміты і служачыя прыватных прадпрыемстваў — пазбаўлена рэальных правоў здзяйсняць «демас кратас». Яны пазбаўлены права на справядлівую і гарантаваную долю прыбытку на прыватных прадпрыемствах, ім застаўлена толькі права на прыстойныя дэманстрацыі і забастоўкі, г. зн. права вырваць з цэпкіх шчупальцаў працадаўцаў крошкі ад іх прыбыткаў, а ў старасці разлічваць на спагадлівую міласэрнасць з боку працадаўцаў. Іншымі словамі, дэмакратыя ЗША таксама ўшчэрбна, як і рабаўладальніцкая, і феадальная. Гэта дэмакратыя працадаўцаў. Абсалютны характар (г. зн. усеагульны, аднолькавы для ўсіх слаёў грамадства) яна набывае толькі ў рэкламных спусах, дзе і «дэмакратыя» і «правы чалавека» падаюцца як цалкам рэалізаваныя. У гэтых нацягваннях рэкламы хаваецца ідэалагічны падлог, спекулятыўнасць і «анатомія нянавісці» да тых, хто жадаў бы неяк парушыць дэмакратыю працадаўцаў.

Рэальная і абсалютная дэмакратыя існавала толькі ў далёкія часы дадзяржаўнага, абшчыннага ладу, калі маленькая абшчына — сяло ці маленькі горад (поліс, цывітас) маглі сабраць сваіх грамадзян на агульны сход, непасрэдна вырашаць свае як унутраныя, так і знешнія справы. Сход абшчыннікаў і з´яўляўся «дэмакратыяй» (уладай народа), прычым уладай таталітарнай. Правы чалавека-абшчынніка рэгуляваліся традыцыямі звычайнага права, якое фарміравалася стагоддзямі. Парушальнікаў гэтага права выганялі з абшчыны.

Першыя формы дзяржаўнай улады выраслі з абшчыннай дэмакратыі: па меры асвойвання новых зямель узніклі даччыныя абшчыны, якія не гублялі сувязь са сваёй метраполіяй. Некалькі даччыных абшчын і метраполій, якія змяшчаліся на шматкіламетровых тэрыторыях, не маглі ўжо збіраць усеабдымныя сходы для вырашэння спраў сваіх родных абшчын (полісаў).

Замест усебаковага схода пачалі збірацца толькі важакі гэтых абшчынаў — сенексы. У выніку з´явілася першая форма міжабшчыннай улады — сенат. Значыць, разам з узнікненнем дзяржаўнай улады рэальная дэмакратыя перарастае ў міжабшчынную ўладу правіцеляў-сенатараў, якія фармальна з´яўляліся прадстаўнікамі «демаса». Такая сутнасць дзяржаўнай дэмакратыі ў адрозненні ад абшчыннай. І задача заключаецца ў тым, каб не «латаць дзіркаў» гэтай «дэмакратыі», а рабіць яе бліжэйшай да «демаса» і яго канкрэтным патрэбнасцям, утвараць у рэальную дэмакратыю.

Ужо ў першых сенатах было вельмі цяжка выпрацаваць адзінае рашэнне, бо для адных абшчын яно падыходзіла і адпавядала іх інтарэсам, а для іншых не падыходзіла (скажам, у адных абшчынах пераважала земляробства, а ў іншых — рыбалоўства ці жывёлагадоўля). Гэтае рознагалоссе, неадпаведнасць інтарэсаў дажыла да нашых дзён і неўсвядомлена праяўляюцца ў Вярхоўных Саветах: кожны дэпутат адстойвае інтарэсы толькі свайго рэгіёна і часта не жадае разумець інтарэсаў іншых вобласцей і іх дэпутатаў. І памылкай старшынь Саветаў з´яўляецца імкненне выпрацаваць «сярэднюю пазіцыю» па гаспадарчых справах большасцю галасоў. Падобныя метады рашэнняў, асабліва гаспадарчых пытанняў, не могуць адпавядаць патрэбнасцям усіх рэгіёнаў, і заўсёды будуць захоўваць у сабе пагрозу канфліктнасці.

Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД), якая нарадзілася, знаходзіцца ў трох розных кліматычных паясах. І разумець нацыянальныя патрабаванні (г. зн. нацыянальныя патрэбы, іх гаспадарчыя патрэбнасці) мы зможам, толькі разумеючы ўмовы рэгіянальнай вытворчасці.

Прага рэкламных «дэмакратаў» да спекулятыўнай нажывы ўжо дэманструе свой драпежны выскал (назіраецца аграбленне непасрэдных вытворцаў матэрыяльных выгад і каштоўнасцей палітыкай цэн і эмісіяй грошай, масавае «адмыванне» грошай, якія здабыты сумленным шляхам, дзеля нажывы, падзенне нораваў і дэградацыя культуры). Фарміруюцца дзве сацыяльна-эканамічныя праслойкі грамадства — палацаў і хацінаў, багатых і бедных. Адпаведна ўзрастае антаганізм (анатомія нянавісці) паміж імі, выспявае таталітарны дыктат з боку рэкламнай дэмакратыі (прагрэсіўныя планы перабудовы дэградавалі ў дэмагогію).

Таталітарны дыктат таксама мае сваю даўнюю гісторыю. Яго не прыдумалі сучасныя мысліцелі і правіцелі. Ён фарміраваўся як паралельныя да дэмакратыі метад і сістэма дзяржаўнага ўпраўлення яшчэ ў старажытных грэкаў і называўся «тыраніяй». У феадальную эпоху таталітарны дыктат называўся «абсалютызмам» ці «інквізіцыяй». І зараз гэты дыктат дзяржаўнай улады ахоплівае ідэалогію, права, культуру, сацыяльныя адносіны. Таталітарны дыктат у сацыяльных адносінах выяўляецца ў падаўленні забастовак і дэманстрацый, а таксама ў таталітарным кантролі за грамадзянамі. Літаральна ў кожнай дзяржаве Еўропы, Азіі і Амерыкі існуе служба тайнай інфармацыі аб паводзінах сваіх грамадзян. Да сярэдзіны 20 ст. яна існавала ў выглядзе спецыяльных картатэк, а цяпер змяшчаецца ў электронных сістэмах. У ЗША кожная паліцэйская машына па радыё звязана з гэтай электроннай сістэмай, і паліцэйскі зможа атрымаць «з калёсаў» вычарпальную інфармацыю аб любым грамадзяніне: яго сямейным становішчы і сваяках, працы і месцы жыхарства, здароўі, характару, узроўню адукацыі і, вядома, палітычных поглядах. Падрыхтоўка да вайны і вайна 1941—1945 гадоў прывялі да фарміравання ў Еўропе двух магутных таталітарных лагераў — Германіі і СССР. Найбольш небяспечным аказаўся фашызм. Вайна парушыла і фашызм, і каланіяльны расізм. Але хутка ўзніклі ваенныя блокі, а разам з імі «халодная вайна» адрадзіла таталітарызм, але ўжо блокавы — у Заходняй і Ўсходняй Еўропе.

Канешне, у заходнім таталітарызме рэалізуецца толькі адзін бок — барацьба з наркабізнесам, тэрорам, аграбленнямі і ўсім тым, што прыносіць шкоду прыватнай уласнасці. Асобай тайнай застаецца барацьба супраць «шкодных» палітычных тэорый, супраць рэжымаў, якія канфліктуюць з «дэмакратыяй» працадаўцаў. Праяўленнем гэтай барацьбы стала «справа» Хонэкера. Калі нам заняць пазіцыю заходняга боку, то мы павінны былі б патрабаваць для расправы з-за мяжы кожнага «беляка», «бандэраўца», ці любога іншага памагатага фашыстаў, на сумленні якіх — забойствы месных жыхароў, спаленыя вёскі і гарады.

У ЗША, Англіі і Германіі таталітарная дзяржава («дэмакратычная») заўсёды трымала на ўліку іншадумцаў, стварала ім у грамадстве асобыя ўмовы выжывання. Успомнім праславутую «забарону на прафесіі» у той жа Германіі. Зараз гэта форма таталітарызма туманіць галаву «дэмакратам» з некаторых краін Усходняй Еўропы, якія не навучыліся яшчэ бачыць скрыты таталітарызм.

Канешне, публіцысты Захаду і дамарослыя дэмакраты «заўважаюць» і эмацыянальна крытыкуюць толькі наш таталітарызм і памоўчваюць наконт іншых таталітарных сістэм у сябе.

Як бачым, рэкламная дэмакратыя і ўсёабдымны таталітарызм з´яўляюцца блізнятамі-братамі і ў далёкім мінулым, і ў сучаснай «цывілізаванай» дзяржаве. Так вырошчваюцца беспрынцыпныя кампрадоры.

**У. ЯГОРЫЧАЎ,**
**кандыдат гістарычных навук.**

## Насустрач 50-годдзю універсітэта

**І. А. КАРПЮК, дацэнт: «Чалавецтва заўсёды выхоўвала дзяцей, і лепшыя людзі свайго часу жадалі рабіць гэта добра, жадалі гэтаму вучыцца. Захаваем гэтыя пажаданні і ў наш трывожны час. Тым больш, што мы адраджаем нацыянальную школу. Няхай Педагогіка будзе заўжды патрэбна!»**

# Прыцяжэнне «Рубікона»

**Эксперыментальнаму навукова-педагагічнаму атраду ЭНПА кафедры педагогікі «Рубікон» у гэтыя дні споўнілася 11 год. Цэлых адзінаццаць. Усяго адзінаццаць.**

З асобым трапятаннем успамінаем першыя гады існавання атрада. У той час мы былі маладымі, наіўнымі і па-добраму максімалістамі. Адсутнасць педагагічнага вопыту і ведаў кампенсавалася энтузіязмам і велізарным жаданнем быць патрэбным і карысным дзецям.

Нямногія студэнты згаджаліся за зусім невялікія грошы папрацаваць тры летнія месяцы (лепшых у годзе) ў дзіцячым лагеры. Ды яшчэ трэба было здаваць датэрмінова ўсе экзаменацыйныя сесіі, што з'яўляецца малапрыемнай і цяжкай справай. Некаторыя нас шкадавалі і спачувалі нам, іншыя не разумелі, а іншыя прастадушна лічылі, што лагер — лепшае месца для адпачынку. Але аднадумцы знайшліся. Барыс Саакян, Генадзь Жытко, Вадзім Палякоў, Алена Мінько і іншыя былі першымі. З іх пачынаў сваю гісторыю педатрад. А ўсяго з той пары каля 120 чалавек прайшлі незабыўную школу «Рубікона».

... Гартаю пажаўцеўшыя ад часу фотаздымкі... Маладыя, прыгожыя, заўзятыя і натхнёныя твары. Аб кожным з гэтых хлопцаў можна напісаць нямала цёплых радкоў — усе яны таленавітыя, разумныя, гаваркія і дэмакратычныя. Зараз гэта слова ўспрымаецца спакойна. А тады, 11 гадоў таму, мы за незвычайныя для таго часу ідэі, метады і формы працы былі біты балюча і неаднаразова. Нічога — выстаялі, вытрымалі.

Нядаўна адзін з кіраўнікоў лагера, дзе мы шмат гадоў працавалі, пры сустрэчы з пачуццём няёмкасці прызнаўся, што зараз яны здзяйсняюць тое, за што нас раней лаялі. Падумалася мне — значыць, не дарэмна мы ўсё гэта пачыналі. Тое, аб чым загаварылі зараз, было для педатрада нормай з першага году існавання. Дарэчы, і зараз аздараўленчыя лагеры — малапрывабныя для дзяцей, нягледзячы на тое, што грошай дзяржава траціць на іх вельмі шмат. А значыць, і зараз патрэбны маякі перадавога вопыту, якія паказваюць шлях для арганізатараў летняга адпачынку дзяцей.

«Рубікон» — гэта не толькі калектыў аднадумцаў, гэта яшчэ навуковае аб'яднанне. Члены атрада пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры педагогікі даследуюць шмат цікавых навуковых тэм: вывучаюцца асаблівасці функцыяніравання і жыццядзейнасці часовых дзіцячых аб'яднанняў (ЧДА), спецыфіка псіхолага-педагагічнай службы ў іх, карэкцыя дэвіянтных паводзін падлеткаў, структурна-дынамічныя асаблівасці педагагічнай дзейнасці і магчымасці ЧДА для прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў і інш. Вынікі даследаванняў, новыя педагагічныя ідэі смела ўтвараюцца ў жыццё на вопытна-эксперыментальных пляцоўках: у летніх і зімовых аздараўленчых лагерах, на выязных зборах і ў іншых часовых дзіцячых аб'яднаннях.

Вопыт «Рубікона» абагульнены ў кандыдацкіх дысертацыях, апублікаваных дыпломных і курсавых працах, вучэбных дапаможніках, метадычных рэкамендацыях, артыкулах. Аб педатрадзе неаднойчы расказвалі розныя газеты і часопісы, радыё і тэлебачанне. Ажыццяўляецца сяброўская перапіска з блізкімі аб'яднаннямі з многіх рэспублік.

Наперадзе новы сезон, а значыць, новыя клопаты, новыя ідэі (вельмі смелыя для нашага трывожнага і безграшовага часу). Але, нягледзячы ні на што, «Рубікон» працуе, поўны творчых задумак і планаў, зноў запрашае таленавітых і несупакойлівых студэнтаў праверыць правільнасць выбрання педагагічнай прафесіі ў практычнай працы з дзецьмі — для гэтага няма больш надзейнага спосаба. Калі сярод Вас, хто чытае гэты матэрыял, ёсць такія — прыходзьце на кафедру педагогікі.

Прайшло адзінаццаць гадоў.



Але такія ж юныя, таленавітыя новыя члены «Рубікона». І ў гэтым сакрэт яго даўгалецця і маладосці. Адпрацавана больш 35 зменаў у розных дзіцячых лагерах, праведзены дзясяткі выязных збораў, рэалізавана шмат навуковых праграм і педагагічных праектаў. Тысячы дзяцей дакрануліся да «Рубікона», і для многіх гэта была незабыўная сустрэча, якая навучыла па-новаму глядзець на сябе, на педагогаў, на жыццё.

На Гарадзеншчыне нямала добраўпарадкаваных, з каменнымі корпусамі, ацяпленнем, відэа і ігральнымі апаратамі, цудоўным харчаваннем лагераў. Тыя, у якіх працаваў «Рубікон», да іх ліку аднесці цяжка... Мы не выбіралі дварцоў для працы. Але вы спытайцеся ў дзяцей, дзе ім было лепш? І адказ будзе адназначным: там, дзе працаваў «Рубікон». А вось пытанне, чаму, напэўна, выклікае замінку. Можна расказаць аб незвычайных рубіконаўцах, цікавых забаўках і прыгодах, незвычайна цёплых, даверлівых адносінах з педагогамі, рамантыцы, начных кастрах і шчырых размовах да світання, дзіўных песнях пад гітару, новых сябрах і шмат-шмат чым іншым. Але, напэўна, «Рубікон» прыносіць з сабой у лагер тое, што можна адчуць толькі сэрцам.

Так няхай гэтае добрае прыцяжэнне «Рубікона» надоўга застанецца ў сэрцах тых, хто з ім сустракаўся.

**А. КАРДАБНЁЎ,**
**нязменны кіраўнік ЭНПА «Рубікон» на працягу 11 год, ст. выкладчык, кандыдат педагагічных навук.**

# ПЕДАГОГІКА — У творчым пошуку — кафедра

**Кафедра педагогікі — адна са старэйшых у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы, разам з універсітэтам восенню 1994 года ёй споўніцца 50 год. На калектыў кафедры выпадаў заўсёды вялікі аб'ём вучэбнай, навукова-метадычнай, навуковай і выхаваўчай работы. Рэктарат абгрунтавана ўскладваў надзеі на ініцыятывы кафедры ў інтэнсіфікацыі навучання студэнтаў, арганізацыі летніх і семестравых педагагічных практык, удасканаленні псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў. Трэба сказаць, што члены калектыва кафедры педагогікі рупліва выконвалі даручэнні кіраўніцтва ВНУ, самі праяўлялі ініцыятыву.**

На кафедры цяпер працуе 12 выкладчыкаў, вучацца 3 аспіранты. Навуковай працай займаюцца 8 саіскальнікаў вучонай ступені. Вучэбна-дапаможную работу забяспечваюць 2 лабаранты. Больш за 90% членаў кафедры маюць навуковыя ступені і званні. У саставе выкладчыкаў добра супрацоўнічаюць разам вопыт і мудрасць дацэнтаў І. І. Пракоп'ева, І. А. Карпюк, Я. І. Будоўскага, М. А. Мінайлава, маладосць і творчы пошук ст. выкладчыка, кандыдата педагагічных навук А. А. Кардабнёва, ст. выкладчыка Т. М. Прудко, грунтоўнасць і працавітасць Н. М. Петрыкавай, В. М. Дарошка, М. А. Зяньковай, школьны вопыт М. У. Міхалковіча, В. В. Грынкевіча. Многа старанняў праявіла ў стварэнні кабінета кафедры ст. лабарант С. І. Сяўрук.

Аналізуючы адзінаццацігадовы вопыт кіравання кафедрай, магу зрабіць вывад, што калектыў найбольш змацавала сумесная праца над калектыўнай тэмай «Падрыхтоўка настаўніка ва ўмовах бесперапыннай педагагічнай адукацыі» (кіраўнік прафесар В. П. Таранцей). Акрамя таго, выконваецца ў плённай сувязі з установамі адукацыі па заданню Міністэрства адукацыі яшчэ адна дзяржразліковая навуковая тэма. Штогод кафедра выпускае ад двух да пяці аўтарскіх або калектыўных дапаможнікаў, манаграфій, кніг. Сярод іх толькі за апошнія пяць год надрукаваны манаграфіі: «Вартасныя арыентацыі падлеткаў» (дац. І. І. Пракоп'еў), «Настаўнік-стажор у школе» (дац. І. А. Карпюк), «Тварам да моладзі», «Падрыхтоўка настаўніка ва ўмовах бесперапыннай педагагічнай адукацыі» (праф. В. П. Таранцей), калектыўныя работы, заваяваўшыя прызнанне вучоных і практыкаў у рэспубліцы, такія як «Педагагічная практыка студэнтаў», «Паслядыпломная адукацыя маладога настаўніка» і іншыя. Усяго членамі кафедры надрукавана больш за 400 навуковых прац, сярод іх каля 50 кніг, манаграфій, дапаможнікаў, метадычных распрацовак. Сярод лепшых даследчыкаў — ветэраны педагагічнай навукі нашай ВНУ І. А. Карпюк, І. І. Пракоп'еў, Я. І. Будоўскі. Плённая навуковая праца дае магчымасць прапанаваць студэнтам на выбар 22 спецкурсы, спецсемінары і практыкумы, палова з якіх — аўтарскія, а значыць, існуюць практычна толькі ў нашай ВНУ. Сярод такіх — «Метады і прыёмы ўзаемадзеяння настаўніка з нефармальнымі аб'яднаннямі моладзі» (праф. В. П. Таранцей), «Малады настаўнік у выхаваўчай сістэме школы» (дац. І. А. Карпюк), «Педагагічныя асновы выкарыстання рэжыма рухавай актыўнасці для павышэння ўзроўня навучання» (ст. выкладчык В. П. Шчарбініна) і іншыя. Толькі за апошнія 6 гадоў кафедра арганізавала па сваёй праблеме 5 канферэнцый, семінараў, аб'ядноўваючы на іх навуковыя сілы ўсяго рэгіёна і рэспублікі ў цэлым.

Значную частку намаганняў кафедра траціць на ўдасканаленне навучальнага працэсу. Час рэцэптурнай і тэарэтычнай педагогікі прайшоў, калі педагогіка павінна была абгрунтаваць камуністычную сістэму выхавання. Сёння патрабуецца, па-першае, настаўнік-тэхнолаг, здольны творча будаваць навучальна-выхаваўчы працэс ва ўстановах рознага тыпу. Большасць студэнтаў павінна рыхтавацца менавіта да гэтай працы. Па-другое, невялікая частка студэнтаў (5-7%) павінна рыхтавацца як педагогі-даследчыкі, складаць рэзерв будучых навукова-педагагічных кадраў. З гэтай нагоды выкладчыкі кафедры пачалі ўкараненне пабудаваных на нацыянальнай аснове новых тэхналагічных курсаў — «Сучасныя педагагічныя тэхналогіі», «Гісторыя педагогікі Рэспублікі Беларусь», «Педагагічнае майстэрства», «Сацыяльная педагогіка». Кафедра ўжо мае каля 10 відэафільмаў і відэапраграм. Распрацоўваюцца камп'ютарныя навучальныя праграмы, многія заняткі праводзяцца на базе школ. Вопыт навукова-метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу на кафедры адобраны Калегіяй МА РБ.

На новым шляху існуе нямала праблем, бо ВНУ і, у прыватнасці, кафедра, засталіся ў інфармацыйнай блакадзе: нават літаратуры паступае ў 5-10 разоў менш, чым раней. Хвалююць неадназначныя адносіны вучоных рада факультэтаў да аб'ёмаў практык, долі дысцыплін псіхолага-педагагічнага цыкла ў навучальных планах.

Жадае большага развіццё студэнцкай навукі на кафедры. Амаль поўная адсутнасць дыпломных прац па педагогіцы на факультэтах не стварае добрых умоў для работы са студэнтамі значнай колькасці кваліфікаваных вучоных-педагогаў. Многа год удаецца ўтрымаць стабільную працу эксперыментальнага навукова-даследчага педагагічнага аб'яднання «Рубікон». Нядрэнна працуюць навуковыя гурткі большасці дацэнтаў кафедры на ўсіх 8-мі факультэтах, дзе выкладаюцца псіхолага-педагагічныя прадметы. Заўсёды ў красавіку кожнага года мы з удзячнасцю ўспрымаем даклады студэнтаў. Заўсёды радуемся — якія разумныя ў нас студэнты! Асабліва, калі яны, як М. Чыркова, А. Фядута, выходзілі пераможцамі на педагагічных алімпіядах рэспублікі і былога Саюза.

Кафедра падтрымлівае сувязі з 25 ВНУ і НДІ Беларусі, краін блізкага замежжа, Польшчы, Чэхаславакіі, Балгарыі, Германіі. Замежныя вучоныя не раз былі нашымі гасцямі.

У невялікім артыкуле нельга раскрыць усе напрамкі жыццядзейнасці кафедры — даволі складанага элемента вышэйшай навучальнай установы. Калектыў кафедры поўны творчых планаў і задумак.

**В. ТАРАНЦЕЙ,**
**заг. кафедры педагогікі, прафесар, кандыдат педагагічных навук.**



# НАВУКА ДЛЯ ЎСІХ

**М. А. ЗЯНЬКОВА, дацэнт: «Дарагія калегі! Я ўпэўнена, што Ваша мудрасць, унутраная культура і інтэлігентнасць дапамогуць заставацца адданымі ідэям дабра, гуманізма, сумленнасці той справе, якой Вы служыце. Жадаю Вам плённай працы ва ўсіх напрамках педагагічнай дзейнасці і пачуцця гонару за поспехі Вашых супрацоўнікаў!».**

## «Адшукай усяго пачатак і ўсё зразумееш»

**З пачатку шостага семестра студэнтам педагагічнага патока матэматычнага факультэта пашчасціла пазнаёміцца з новым прадметам — «Педагогіка і методыка выхаваўчай работы». Пасля не зусім звычайнага традыцыйнага знаёмства старшы выкладчык Анатолій Анатольевіч Кардабнёў, які загадзя вывучыў асабістыя справы ўсіх студэнтаў, вымавіў прыкладна наступнае: «Адшукай усяго пачатак і ўсё зразумееш». Гэта выклікала глыбокае непаразуменне ў матэматычных розумах, якія звычайна шукалі толькі вытворныя велічыны, інтэгралы, радыкалы і г. д.**

За мінулы семестр пры вывучэнні педагогікі мы цвёрда зразумелі адно: педагогіка — такая ж сур 'ёзная навука, як і іншыя.

З асаблівым нецярпеннем студэнты чакалі 3-дзённага інструктыўна-метадычнага збора, які праходзіў на базе Палаца дзіцячага і юнацкага мастацтва. Збор даў уяўленне аб працы важатага, пабудаваў практычную базу на фундаменце тэарэтычных звестак, якія мы атрымалі на спецкурсе «Методыка работы ў дзіцячым аздараўленчым лагеры». Зусім у іншым свеце мы ўбачылі свайго выкладчыка педагогікі А. А. Кардабнёва. Ён паказаў сябе цудоўным турыстам, арганізатарам сумесных творчых спраў. Самастойная работа студэнтаў спалучалася з практыкумамі (псіхалагічным, іграvым, турыстычным, музыкальным, дэкаратыўна-афарміцельскім, спартыўным і інш.), якія цікава праводзілі метадысты Палаца.



Увогуле, інструктыўна-метадычны збор апраўдаў сваю назву. Многія з рэкамендацый метадыстаў збора ў тым ці іншым выглядзе былі выкарыстаны ў лагеры. Пры падрыхтоўцы камандных мерапрыемстваў студэнты праяўлялі ініцыятыву і гумар. За гэтыя тры дні аб многіх сваіх аднакурсніках мы даведаліся больш, чым за тры гады сумеснай вучобы, і гэта было для нас прыемнай нечаканасцю.

Пасля летняй экзаменацыйнай сесіі студэнты адправіліся ў лагеры праверыць свае веды ва ўмовах, максімальна прыбліжаных да баявых. Але студэнтам гэта не страшна, таму нават з суровага лагернага жыцця яны змаглі атрымаць максімум задавальнення, замацаваць на практыцы свае веды.

Мы не будзем гаварыць ад імя ўсяго матфака, але асабіста нам летняя практыка спадабалася. Цёплыя зносіны з дзецьмі прыгадалі нам наша бестурботнае дзяцінства. І цяпер мы былі на месцы тых, хто некалі выхоўваў нас.

За гэтыя тры тыдні мы адцягнуліся ад мітусні студэнцкага жыцця, каб акунуцца, нарэшце, у мітусню жыцця педагагічнага. Праца ў лагеры навучыла нас самастойнасці ў прыняцці рашэнняў і адказнасці за свае ўчынкі, і за даручаных нам дзяцей.

**А. ГРЫНЬ,**
**А. САДОЎСКІ,**
**студэнты матэматычнага факультэта.**

---

**Н. Н. ПЕТРЫКАВА, дацэнт: «Педагагічная выхаваўчая дзейнасць — асаблівая, бо менавіта тут прафесійная роля мае непасрэдны выхад у вобласць чалавечых зносін. Выхавацель і навучэнцы ўступаюць у эмацыянальны і інтэлектуальны кантакты: і для выхавацеля мала валодаць пэўным комплексам ведаў і навыкаў. Я за падрыхтоўку ў сценах нашай ВНУ педагога-выхавацеля з пэўнымі рысамі і якасцямі, якія праяўляюцца ў яго дзеяннях, у адносінах да выхаванцаў. Накапленне вопыту выхаваўчай дзейнасці можна акрэсліць як вопыт зносін, у якім і могуць рэалізавацца ўзаемныя дамаганні выхавацеля і выхаванца. Быць добрым настаўнікам можна толькі тады, калі будзеш добрым выхавацелем. Педагогіка здольна аб 'яднаць усе навукі, усіх выкладчыкаў, надаць высакароднасць выхаваўчай атмасферы універсітэта.**

**Я. І. БУДОЎСКІ, дацэнт: «Для кафедры характэрны здаровы мікраклімат, узаемадапамога, узаемная патрабавальнасць, чуласць і ўвага адзін да аднаго».**

---

**Даведацца аб навуковым і метадычным патэнцыяле калектыва кафедры педагогікі — значыць пазнаёміцца толькі з яе першай працоўнай паловай. Калектыў кафедры — гэта педагогі-прафесіяналы, якія ўмеюць на справе паказаць, што выхаванне — гэта мастацтва зносін. Выкладчыкі і супрацоўнікі з задавальненнем праводзяць не толькі працоўны час, але і адпачынак разам.**

Атмасфера цяпла, падтрымкі, узаемаразумення дапамагае нам у самыя адказныя моманты. Выпраўляючы на абарону дысертацыі, калегі даюць не толькі карысныя парады, але і знаходзяць падбадзёрваючыя словы і нават умудраюцца зарыфмаваць іх і падабраць адпаведную мелодыю. Напрыклад, з дапамогай мелодыі І. Дунаеўскага мы стварылі «параду на дарогу» старшаму выкладчыку В. В. Грынкевічу (усе тэксты друкуюцца ў скарачэнні):

Легко на сердце от вести нам снова.
Ее нам Виктор Васильич принес,
пад увагу сумныя думкі, арганізаваць душэўнае, сагрэтае дамашняй утульнасцю, свята. Дэвізам калектыву сталі словы:

Не думай ты о праздниках всегда.
Наступит время — сам придет, наверное,
Пройдет, ты вспоминай о нем тогда,
Мгновения, мгновения, мгновения...
Но вот, когда он все-таки пришел,
Глоток воды во время зноя летнего,
Не суетись, а накрывай на стол,

Он не привык робеть в беде
И отступать назад.
На кафедре все говорят:
«Солдат, всегда солдат».
Он педагогику ведет
Зимой и в дни весенние.
На семинарах он всегда
В отличном настроении.
Вот он за кафедрой стоит,
Сам черт ему не брат.
Так значит, правду говорят:
«Солдат, всегда солдат!»

У такія ўрачыстыя хвіліны мы просім успомніць аб баявых подзвігах, аб загінуўшых сябрах, аб цяжкасцях, мы ўражаны стойкасцю, трываласцю і мужнасцю нашых калег, па-новаму для сябе разумеем, чаму яны ўсё ж выстаялі, вярнуліся з перамогай.

Такія сяброўскія сустрэчы праходзяць у нас заўсёды ярка, змястоўна, захоўваючы цяпло ў сэрцы. У такі момант кожны з нас праяўляецца іншы раз з нечаканага боку, дэманструючы і багатую эрудыцыю, і кемлівасць,

## Людзей нецікавых на свеце няма...

### *або аб нефармальным жыцці супрацоўнікаў кафедры педагогікі*

Что диссертация к сроку готова,
И он ее уже даже отвез.
Пускай же легкою будет защита,
Пусть благосклонным к Вам будет Совет,
Пусть убедительный, крепче гранита,
На их вопрос будет точный дан ответ.

Выкладчыкі не пакідаюць без увагі ні юбілеі калег, ні ўступленне на пасаду, ні перамогу на вучонай радзе.

Калі мы радаваліся за Майю Аляксандраўну Зянькову, якая некалькі гадоў таму стала дацэнтам, прыгатавалі ёй такое віншаванне:

Спокойно, товарищи, все по местам.
Зеньковой доцента вручаем.
Здоровья, успехов и творчества ей
Всей кафедрой дружно желаем.
Восславим заслуги, которые ей
Давались и потом, и кровью.
Так пусть же сегодня звучит посильней
Сей гимн, что придуман с любовью.

А патрабавальнага, адказнага М. У. Міхалковіча, які абараніў кандыдацкую дысертацыю па сувязі эканомікі і адукацыі, чакала такое музычнае прывітанне:

Колькі ў нас турбот?
Цяжка палічыць.
Толькі з іх адна
Найперш клапаціць.
Эканоміка—
Як да яе падысці,
З педагогікай
Як яе сплясці?
Міхалковіч
Той сакрэт знае.
З бляскам даказаў
У навуцы ён:
Каб настаўніка
Сёння рыхтаваць,
З эканомікай
Трэба сябраваць!

У гэту неспакойную гадзіну, калі кожны павяз у сваіх уласных праблемах, турботах, клопатах, як ніколі патрэбна ўмець не браць

Отдай за это «зайчика» последнего!

І аддаем, і пячэм, і накрываем, і прыдумваем гумарыстычныя тосты, нават прызы разыгрываем. Праўда, самавара казённага не хапае (калектыў вялікі), дапамагае аддзел маркентынгу ці бібліятэка свой старэнькі чайнічак дасць. Але гэта не галоўнае. Важна, каб не згубілі тыя добрыя традыцыі разам праводзіць стары год, павіншаваць мілых жанчын са святам 8 Сакавіка. Ці не прыемна атрымаць ад мужчын такое цёплае віншаванне, якое прысвечана паважанай усімі Іне Анатольеўне Карпюк?

Нам нравится, что в коллективе есть
Пленительная, мудрая, родная,
Готова пережить любую весть,
Воспрянуть духом, нам пример являя...
Спасибо Вам, и сердцем, и душой
За то, что Вы нас всех, не зная сами,
Так любите, за ласковую речь,
За радость встреч такими вот часами,
За Вашу образованность и такт,
За знанья, отдающие студентам,
За то, что у Вас, увы, нельзя забрать,
Хотя б на час опыт, под проценты.

Не могуць паскардзіцца на адсутнасць увагі нашы дарагія ветэраны Вялікай Айчыннай. Дзень Перамогі лічым святым, таму з хваляваннем адзначаем і віншуем, і прадугледжваем усё да дробязяў: і любімыя стравы, і прыбраны пакой, і музыкальныя нумары, і падарункі, і, вядома, індывідуальныя віншаванні, якія атрымаў, напрыклад, наш паважаны Іван Іванавіч Пракоп 'еў:

... Студентки глазки строят ли,
Грозят ли «окружением»,
Иван Иваныч выйдет из
Любого положения.

і свой цудоўны ўнутраны свет. Памятаеце, як у Я. Еўтушэнка:

Людей неинтересных в мире нет.
Их судьбы, как история планет,
У каждой все особое, свое.
И нет планет, похожих на нее.

Спытаецеся, хто ж «завадатар»? Ды ўсе ў рознай ступені. Галоўную скрыпку грае шэф, даючы дабро, карэктыруючы, фінансуючы (бывае што, з свайго кашалькуǃ).

Некаторыя добрыя традыцыі пастаралася прынясці ў калектыў аўтар гэтых радкоў. Яе вопыт у правядзенні і арганізацыі «неафіцыйных сустрэч» некалькі абнавіў атмасферу, а ўменне рыфмаваць, пераладжваць песні на неабходную хвалю і артыстычна іх выконваць, упрыгожвае любое свята.

Правай рукой у арганізацыі свята з 'яўляецца В. М. Дарошка. Яна і рэцэнзуе, і падказвае, а калі патрэбна, то і падспявае як мае быць, і неабходную ролю адыгрывае прафесійна.

Ёсць на кафедры маладыя таленты: аспірантка Т. В. Лантух, чый прыгожы голас радуе слых, гатовы слухаць яе гадзінамі. Акампаніятар — А. А. Кардабнёў, у якога яшчэ захавалася шмат юнацкага запалу і творчай фантазіі. Малады душой і цудоўна выконвае ролю вядучага Я. І. Будоўскі, чый мяккі гумар, трапна падабраны тост, далікатнае звяртанне, інтэлігентны выгляд упрыгожваюць любую сустрэчу.

Самае галоўнае, што на кафедры цаpye атмасфера ўзаемапавагі, прыстойнасці, адкрытасці. Яе актыўна падтрымлівае Віктар Пятровіч. Вопытныя педагогі старэйшага пакалення паказваюць прыклад высакароднасці малодшым. Вучаць быць адказнымі, цярпімымі да чужых слабасцяў, радавацца поспехам калег. У такой атмасферы хочацца тварыць, добрае пераймаць, праяўляць сябе з лепшага боку, удасканальвацца. А гэта нямала, праўда?

**Т. М. ПРУДКО,**
**прафорг, старшы выкладчык кафедры педагогікі.**

## *З усмешкай*







**Фота 2-ой і 3-яй старонак А. КАРДАБНЕВА і Е. ФАЛЕЕВА.**
**Малюнкі Е. ФАЛЕЕВА.**

*Старонкі гісторы*

**На Воранаўшчыне нарадзілася многа знакамітых людзей, якія яркім талентам і напружанай працай праславілі свой край. Адным з іх быў Караль Падчашынскі — загадчык кафедры архітэктуры Віленскага універсітэта ў 1819—1832 гг.**

# Караль Падчашынскі — архітэктар з вёскі Журмуны

**КОЎКЕЛЬ,**
**прафесар кафедры гісторыі Беларусі**

Бацька Караля Падчашынскага Ян нарадзіўся ў вёсцы Жусіны цяперашняга Пагарodненскага сельскага Савета Воранаўскага раёна ў 1735 г. Да 1772 г. ён насіў прозвішча Пецюн. Гэтае ж прозвішча насіў і яго дзед Павел, які славіўся на ўсю акругу майстрам рамонтных работ палацаў і касцёлаў. Пазней ён быў запрошаны Каралем Станіславам Радзівілам, віленскім ваяводай у 1768—1790 гг. наглядчыкам за будаўнічымі работамі ў сваіх уладаннях. Каралю Станіславу Радзівілу ў той час належала Журмунскае графства, цэнтр якога — Журмунскі двор — знаходзіцца цяпер на тэрыторыі суседняга Лідскага раёна. За самаадданую працу Павел Пецюн ужо ў сталым узросце быў пераведзены К. Радзівілам на пасаду нашчадка. Пры дапамозе свайго апекуна ён дамогся ўзвядзення сына Яна ў дваранскае званне, які прыняў прозвішча Падчашынскі.

Ян Падчашынскі, як і яго бацька, займаўся будаўнічымі работамі і з'яўляўся прыдворным архітэктарам К. Радзівіла. Веды ў галіне архітэктуры ён атрымаў у вядомага ў той час прафесара архітэктуры Віленскага універсітэта Ваўжынцыя-Стуокі-Гуцэвіча. У апошнія гады свайго жыцця Ян Падчашынскі будаваў касцёлы ў вёсцы Журмуны Воранаўскага раёна і ў вёсцы Бутрыманцы на Віленшчыне. Тут, у Журмунах, у 1790 г. і нарадзіўся ў яго сын, якога ён назваў у гонар свайго папячыцеля Каралем.

Вучыўся Караль Падчашынскі спачатку ў павятовым вучылішчы базілянаў у Брэсце, а пасля ў Крамянецкім ліцэі на Украіне, які з поспехам закончыў у 1813 г. У гэтым жа годзе ён пераехаў у Вільню, дзе паступіў на вучобу ў Віленскі універсітэт. Першыя студэнцкія гады былі цяжкімі: бацька памёр і на вучобу і пражыццё прыйшлося зарабляць самому. Дапамаглі настойлівасць і прыродны талент. З'яўляючыся студэнтам, Караль Падчашынскі адначасова выкладаў ва універсітэце рысунак і чарчэнне. Паколькі ён паспяхова спраўляўся з вучобай і на высокім узроўні забяспечваў выкладанне сваіх прадметаў, яму ў 1814 г. назначылі універсітэцкую стыпендыю і накіравалі на вучобу ў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў.

У 1816 г., пасля заканчэння вучобы, Караль Падчашынкі вярнуўся назад у Вільню, каб выкладаць архітэктуру ва універсітэце. Але працаваць прыйшлося нядоўга. У 1817 г. ён быў накіраваны ў Парыж для ўдасканалення адукацыі. У Парыжы наведваў лекцыі самых вядомых у той час прафесараў архітэктуры Рандалета і Дурандо.

Пасля звароту на радзіму ў 1819 г. магістр філасофіі Караль Падчашынскі быў запрошаны на пасаду загадчыка кафедры архітэктуры Віленскага універсітэта. У 1823 г. атрымаў званне прафесара. Спачатку чытаў курс лекцый па архітэктуры па тэкстах прафесара Дурандо, а па будаўніцтву дарог і мастоў — па настаўленнях Сканзіна і Гаўтэя. Уласныя тэксты лекцый распрацаваў і падрыхтаваў да друку ў канцы 20-х гадоў — першы том яго асноўнай працы «Асновы архітэктуры для студэнцкай моладзі» выйшаў з друку ў 1828 г., другі — у 1829 г., трэці — у 1857 г.

Адміністрацыйную і выкладчыцкую работу Караль Падчашынскі актыўна спалучаў з творчай дзейнасцю. Яшчэ перад ад'ездам у Парыж у 1817 г. ён распрацаваў новы праект галоўнай залы бібліятэкі Віленскага універсітэта (цяперашняй Калоннай залы), праекты кніжных шафаў і іншай мэблі. Пасля звароту з-за граніцы на аснове праекта прафесара М. Шульца перабудаваў Спаскую царкву ў Вільні, памясціўшы ў ёй анатамічку універсітэта, адначасова вёў работы па рэстаўрацыі касцёла Святога Яна. У 1822 г. распрацаваў праект перабудовы франтонаў Віленскага універсітэта і некаторых яго памяшканняў. З спраектаваных унутраных памяшканняў універсітэта заслугоўваюць вялікую ўвагу кабінет мінералогіі і прафесарская чытальная зала, багата аздобленыя прыгожымі дэкаратыўнымі драўлянымі плафонамі і лесвіцамі. У гэтым жа стылі былі аздоблены і ўнутранныя памяшканні Ковенскай ратушы, выкананыя па яго праектах.

У 1824—1825 гг. Караль Падчашынскі спраектаваў і пабудаваў палац Міхаіла Былінскага ў Янушах (недалёка ад Вільні), капліцу на магіле Яна Снядэцкага, якая засталася незакончанай, Тускулянскі палац у Вільні (у цяперашнім парку мікрараёна Жырмунай).

У 1827—1828 гг. па праектах К. Падчашынскага былі пабудаваны помнік рэктару Віленскага універсітэта Геранілу Страйноўскаму (умураваны ў знешнюю сцяну касцёла Святога Яна), прыбудовы — карынфскі порцік да паўднёвага франтона універсітэта і памяшканне пад арган у стылі класіцызма пры Вострай браме. У 1829 г. К. Падчашынскі распрацаваў праект і ажыццяўляў надзор над будаўніцтвам гімназіі ў Слупску. На працягу пяці наступных гадоў (1830—1835 гг.) ён быў заняты распрацоўкай праектаў і будаўніцтвам евангеліцка-рэфарматарскага касцёла ў Вільні (на вуліцы Завальнай) і аднапавярховай вілы ў маёнтку Ліхадзееў. У гэты ж час быў пабудаваны і егіпецкі мосцік у Бернардынскім парку ў Вільні.

У 1833 г. у жыцці Караля Падчашынскага адбыліся значныя змены. Пасля закрыцця Віленскага універсітэта ён быў вызвалены ад пасады загадчыка архітэктуры універсітэта і іншых адміністрацыйных пасад, якія займаў да гэтага часу. Каб пражыць, прыйшлося займацца сельскай гаспадаркай. Час ад часу выконваў і прыватныя заказы. Адным з іх было праектаванне і пабудова вялікага палаца ў Жылічах каля Бабруйска. Вось што аб гэтым палацы піша ў сваёй «Гісторыі архітэктуры Беларусі» вядомы яе даследчык, доктар архітэктуры У. А. Чантурыя: «Палацавы комплекс будаваўся ў два прыёмы: спачатку быў узведзены галоўны корпус, а пазней да яго прыбудавалі працяглае крыло з прыдворнай царквою і дадатковымі жылымі памяшканнямі. Галоўны двухпавярховы корпус вырашаны спакойным аб'ёмам, падкрэсленым у цэнтры вялікім шасцікалонным порцікам карынфскага ордэра з франтонам і бельведэрам пад лесвічнай клеткай. Архітэктурны вобраз палаца просты, затое ўнутранае аздабленне паражае сваёй раскошай. Прыгожыя інтэр'еры, асабліва зала, багата аздобленая лепкай, роспісам, пазалотай, люстэркамі, дэкаратыўнымі тканінамі і г. д.».

Апошнія гады жыцця Караль Падчашынскі пражыў у сваім маёнтку і творчай дзейнасцю практычна не займаўся. Памёр у 1860 г. Пахаваны ў Вільні.

Завяршаючы агляд творчага і жыццёвага шляху Караля Падчашынскага, патрэбна адзначыць, што гэта быў буйны вучоны і знакаміты архітэктар-творца. На жаль, да сённяшняга дня не ўдалося знайсці ні фатаграфіі, ні скульптурнага, ні жывапіснага партрэта вучонага і архітэктара. Застаўся толькі славесны партрэт, пакінуты вядомым даследчыкам гісторыі Віленскага універсітэта Юзэфам Бялінскім (1848—1926 гг.). Па яго апісанню Караль Падчашынскі быў невысокага росту, адносна тоўсты, лысы, твар меў крыху крануты воспай з разумным і іранічным поглядам, самаўпэўнены. Гэты партрэт супадае з партрэтам яго сына Баляслава (Паўла), які на працягу доўгага часу жыў і працаваў у Варшаве. Як і бацька ён быў буйным вучоным і архітэктарам.

Баляслаў (Павел) Падчашынскі нарадзіўся ў 1824 г. у Вільні. Вучыўся ў Віленскай медыка-хірургічнай духоўнай акадэміі. У 1842 годзе для ўдасканалення адукацыі выехаў за граніцу. Пасля вучобы ў вядомых еўрапейскіх акадэміях вярнуўся ў Варшаву. У 1846 г. заняў пасаду прафесара ў школе прыгожых мастацтваў у Варшаве, дзе выкладаў архітэктурны рысунак і перспектыву. Многа будаваў. Па яго словах і пад яго кіраўніцтвам былі пабудаваны касцёлы ў Волі Асавінскай, Старой Веі, Цэрануве, Карытніцы, Добрэ, Капліцы ў шляхецкім інстытуце ў Варшаве, пры касцёле капуцынаў у Любліне, у Валішове, Замосці і інш. Многа было пабудавана прыбудоў, школьных будынкаў, вакзалаў, адрэстаўравана касцёлаў і палацаў. Гэта палацы ў Чаплі Велькай, у Длугашыі, Тамашове Раўскім, Казіміраўскі палац у Варшаве, астранамічная абсерваторыя, касцёл у Красным і іншыя аб'екты.

Баляслаў (Павел) Падчашынскі праектаваў і будаваў таксама помнікі, алтары, займаўся вонкавым афармленнем будынкаў. Пакінуў пасля сябе і вялікую навуковую спадчыну. Многа друкаваў артыкулаў па архітэктуры ў «Атэнэўме віленскім», календары Унгера «Навука перспектывы», у 1850—1851 гг.— дзве часткі «Помнікаў прыгожых мастацтваў», у 1857 г.— «Гістарычны нарыс краёвых старажытнасцей» і шэраг іншых работ.

Вядомы і іншыя продкі з слаўнага роду Падчашынскіх. Адна з іх жыве і працуе ў Гродна. Гэта доктар псіхалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры псіхалогіі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы Святлана Вітальеўна Кандрацьева.

# У выдавецтве ВНУ

**З пачатку года ва універсітэце выдадзена 45 найменняў кніг аб'ёмам каля 200 друкаваных аркушаў.**

У апошнія гады востра адчуваецца недахоп навуковай і вучэбнай літаратуры, тыпавых праграм па базавых і спецыяльных дысцыплінах. Таму значная ўвага надзялялася выданню вучэбных дапаможнікаў, у якіх аўтары выступаюць з новымі падыходамі, адпавядаючымі часу. Выйшлі з друку: другая частка тэкстаў лекцый па паліталогіі, падрыхтаваная дацэнтам кафедры сусветнай культуры — Я. У. Піульскім, вучэбныя дапаможнікі «Інфарматыка і вылічальная тэхніка» пад рэдакцыяй Ларыёнава В. Н. і «Юрыспрудэнцыя Старажытнага Рыма» аўтара Тамсінава В. А. У адпаведнасці з сучаснымі дасягненнямі псіхолага-педагагічнай навукі адлюстраваны праблемы псіхалогіі, адукацыі і выхавання ў тэкстах лекцый «Педагагічная і ўзроставая псіхалогія» прафесара Кандрацьевай С. В.

Асобнымі зборнікамі выйшлі тэзісы агульнауніверсітэцкай навукова-практычнай канферэнцыі «Праблемы інтэнсіфікацыі навучання студэнтаў універсітэта», у якой прымалі ўдзел вучоныя і аспіранты не толькі нашага універсітэта, але і іншых ВНУ нашай рэспублікі, Украіны, Малдовы, Польшчы, Расіі. Надрукаваны таксама матэрыялы міжрэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Узаемадзеянне літаратур у сусветным літаратурным працэсе», якая адбылася ў г. Гродна ў маі бягучага года. У зборніку адлюстраваны тэарэтычныя праблемы параўнаўча-гістарычнага вывучэння літаратуры, пытанні беларуска-рускіх і заходнееўрапейскіх літаратурных сувязяў.

Значная дапамога была аказана слухачам факультэта давузаўскай падрыхтоўкі і падрыхтоўчага аддзялення. Вялікім попытам абітурыента карыстаюцца брашуры «Узоры сачыненняў па беларускай мове і літаратуры для паступаючых у ВНУ» (калектыў аўтараў пад кіраўніцтвам Т. І. Тамашэвіча) і тэксты лекцый па гісторыі Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XVII ст. (калектыў аўтараў кафедры гісторыі Беларусі). Выдадзены многія метадычныя распрацоўкі, якія дапамагаюць абітурыентам лепш арыентавацца пры падрыхтоўцы да экзаменаў.

Адным са сваіх важнейшых абавязкаў лічым выпуск навуковай літаратуры, падрыхтаванай нашымі вучонымі. У першым раздзеле тэматычнага плана выдання літаратуры ва універсітэце на 1993 г. запланавана 8 прац. Але ж, на вялікі жаль, па сёняшні дзень у выдавецтва не паступіў ніводны рукапіс. Звяртаю ўвагу паважаных аўтараў, што да канца года засталося вельмі мала часу, і таму чакаем у самы бліжэйшы тэрмін вашых твораў, падрыхтаваных да рэдагавання і выдання.

Зараз рэдакцыйная група вучэбна-метадычнага аддзела займаецца распрацоўкай тэматычнага плана на 1994 г. Прапановы кафедраў будуць разгледжаны і абмеркаваны на секцыях рэдакцыйна-выдавецкага савета ў пачатку лістапада і вынесены на зацвярджэнне Вучонай рады ў снежні бягучага года. У план будуць уключаны работы, якія цалкам або часткова напісаны. Патрабаванні да аб'ёмаў і якасці падрыхтоўкі рукапісаў засталіся ранейшымі.

З года ў год павялічваецца аб'ём літаратуры, якая выдаецца ва універсітэце. Толькі 26 кафедраў прапанавалі выдаць у наступным годзе 370 ул.— выд. артыкулаў, што перавышае нашы магчымасці.

Нягледзячы на тое, што ў 1992-93 навучальным годзе была некалькі палепшана паліграфічная база, але ж яна застаецца слабай, на якой выдаць звыш 300 ул.— выд. аркушаў няма магчымасці. Спадзяваемся, што ў гэтым навучальным годзе будуць вырашаны некаторыя праблемы выдавецтва, і мы зможам выканаць большасць заказаў кафедраў і забяспечыць добрую якасць друкаванай прадукцыі.

**Л. У. БЯРЭЙШЫК,**
**заг. вучэбна-метадычнага аддзела.**

# Распрацоўка вучэбных праграм працягваецца

**У апошні час шмат змен адбылося ў жыцці краіны, грамадства, у навуцы. Гэта накладвае свой адбітак на арганізацыю навучальнага працэсу ва універсітэце. Змяніўся змест многіх дысцыплін, уведзены новыя навучальныя курсы, спецкурсы, спецсемінары. І гэта, відавочна, патрабуе карэкціроўкі і перапрацоўкі старых і стварэння новых навучальных праграм, бо менавіта яны з'яўляюцца асноўным дакументам у арганізацыі навучальнага працэса.**

Вучэбна-метадычным аддзелам у лютым-сакавіку 1993 г. праведзена перарэгістрацыя тыпавых праграм Міністэрства адукацыі па кожнай дысцыпліне і навучальных праграм, распрацаваных кафедрамі. 39 кафедраў прадставілі інфармацыю.

На 25 кафедрах у верасні бягучага года прааналізаваны стан работы па пытанню наяўнасці і зацвярджэння навучальных праграм.

Трэба зазначыць, што на некаторых кафедрах усе асноўныя дысцыпліны па-ранейшаму выкладаюцца па тыповых праграмах Міністэрства адукацыі СССР і РБ, якія былі выдадзены ў другой палове 80-х, а таксама ў апошнія гады (на кафедрах рускай мовы, рускай і замежнай літаратуры, агульнай і тэарэтычнай фізікі, агульнага і славянскага мовазнаўства, анатоміі і фізіялогіі чалавека і інш.).

Але справа ў тым, што большасць тыпавых праграм, выдадзеных Міністэрствам адукацыі, не адпавядаюць патрабаванням сёняшняга часу і павінны быць перапрацаваны, таму ідзе актыўная карэкціроўка старых і распрацоўка новых праграм (напрыклад, на факультэце правазнаўства, гістарычным, на кафедры беларускай літаратуры і інш.).

Гэта праца вядзецца таксама на новаўтвораных кафедрах: польскай філалогіі і культуры, выяўленчага мастацтва.

Да пачатку 1993/94 навучальнага года распрацаваны і выдадзены праграмы: па паліталогіі, спецкурсу «Асноўныя напрамкі міжнароднага рабочага руху» для студэнтаў спецыяльнасці 02.07.00 — «Гісторыя». 28 вучэбных праграм распрацаваны на кафедры інжынерна-тэхналагічнай падрыхтоўкі і інш.

Відавочна, што на працягу года патрэбна весці работу па распрацоўцы новых навучальных праграм па базавых дысцыплінах і спецкурсах. Пры гэтым кафедрам пажадана карыстацца рэкамендацыямі, якія прапанаваны і зацверджаны вучэбна-метадычным аддзелам (ад 03.02.1993 г.).

У лістападзе бягучага года трэба завершыць працу па дапрацоўцы існуючых праграм, унесці ў іх неабходныя змены і дадаткі, перакласці іх на беларускую мову, правесці іх грунтоўнае абмеркаванне і перазацвердзіць на пасяджэнні кафедры.

Факультэтам трэба абмеркаваць праграмы, распрацаваныя кафедрамі, і прадставіць для зацвярджэння на Вучоную раду універсітэта.

**Я. КАНДРАТОВІЧ,**
**метадыст вучэбна-метадычнага аддзела.**

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць два разы на месяц
Аб'ём газеты — адзін друкаваны аркуш
Зак. 4581
Наклад 2 000 асобнікаў

Газета надрукавана афсетным способам у Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана ў друк у 15.00.
Рэгістрацыйнае пасведчанне 421

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
ВУЧОНАЯ РАДА УНІВЕРСІТЭТА,
ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ,
ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ

В. а. рэдактара
Л.Н. ГАНЦЭВІЧ